# РАЗВІЦЦЁ КАМУНІКАТЫЎНАЙ КУЛЬТУРЫ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

*Н.В. Крыцкая*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Камунікацыя ў сучасным грамадстве становіцца важным механізмам сацыяльнага фарміравання асобы. У яе працэсе адбываецца абмен інфармацыяй, наладжваецца суразмоўніцтва паміж людзьмі. Валоданне камунікатыўнымі навыкамі складае неабходны кампанент адукаванасці чалавека і з'яўляецца паказчыкам яго агульнай культуры.

Мова – гэта адзін са спосабаў пазнання рэчаіснасці. А таму менавіта развіццю камунікатыўных навыкаў, фарміраванню культуры вуснай мовы трэба надаць вялікую ўвагу ў сістэме навучання беларускай мовы.

Малодшыя школьнікі ўступаюць у зносіны тады, калі для гэтага маюцца канкрэтныя прадметна-практычныя падставы, якія абумаўляюць ўтрыманне іх зносін, яго працягласць, інтэнсіўнасць і ўстойлівасць.

Сучасныя праграмы па беларускай мове накіраваны на фарміраванне камунікатыўнай асобы. На ўроках адбываецца развіццё маўленчых здольнасцяў вучняў. Задача кожнага настаўніка мовы – даць веды па пэўнай тэме, навучыць школьніка будаваць пісьмовыя ці вусныя тэксты і фарміраваць уменні якасна ўспрымаць і апрацоўваць інфармацыю, будаваць выказванне ў залежнасці ад мэты, умоў зносін. У сувязі з гэтым на занятках мэтазгодна актыўна практыкаваць розныя вучэбныя сітуацыі з пэўнымі маўленча-камунікатыўнымі намерамі, якія адлюстроўваюць працэс суразмоўніцтва.

**Матэрыял і метады.** Камунікатыўны – які адносіцца да паведамлення як перадачы інтэлектуальнага зместу, у адрозненне ад утрымання эматыўнага (эмацыйнага, эфектыўнага), г.зн. ад выказвання смутку, радасці і іншых пачуццяў, якія складаюць змест некамунікатыўных выказванняў" [1, 200]. Камунікатыўныя ўменні займаюць галоўнае месца ў сукупнасці ўсіх уменняў асобы. Пэўныя аспекты дадзенага пытання акрэслівалі ў сваіх псіхолага-педагагічных працах Я. У. Каратаева, Т. С. Кудраўцава, М. Г, Яленская і інш.

Праблеме развіцця камунікатыўнай культуры малодшых школьнікаў прысвечаны шэраг даследаванняў апошніх дзесяцігоддзяў, сярод якіх працы М.В. Клюева, Ю.В. Касаткінай, Р.В. Аўчарова, А.І. Шемшурынай, А.А. Шустава і інш. У якасці асноўных сродкаў развіцця камунікатыўнай культуры малодшых школьнікаў аўтары выкарыстоўваюць камунікатыўныя гульні, гутаркі, гульнявыя заданні.

Асаблівую ўвагу ў фарміраванні камунікатыўных уменняў і навыкаў адыгрывае тэкст. Пры арганізацыі работы з тэкстам ёсць магчымасць паказаць вучням, як дзейнічаюць у тэксце словы, словазлучэнні, сказы, як яны функцыянуюць.

Па меркаванні пісьменніка і метадыста Я.Коласа, тэкст, які даецца для вывучэння, "павінен закранаць у дзяцей лепшыя струны іх, развіваць успагаднасць, гатоўнасць стаяць за грамадзянскія ідэалы. Ён павінен выхоўваць спачуванне, маральную чуласць" [2, 403]. Праз тэксты вучні далучаюцца да ведаў, да разнастайных звестак, назапашаных людзьмі за гады практычнай і тэарэтычнай дзейнасці, што асабліва важна для падрыхтоўкі і ўдзелу вучняў у сацыяльным жыцці, для сумеснай з іншымі сацыяльнай дзейнасці. Цікавы тэкст задавальняе пазнавальны інтарэс, удакладняе маральна-этычную пазіцыю дзяцей, што, на мой погляд, для вучняў пачатковых класаў значна і эфектыўна.

Пры рабоце з тэкстам малодшым школьнікам можна прапанаваць наступныя заданні: прыдумаць загалоўкі, каб адзін адпавядаў тэме, а другі – ідэі тэксту; прыдумаць працяг тэксту; размясціць абзацы так, каб атрымаўся тэкст; вызначыць і абгрунтаваць стыль і тып тэксту; скласці тэксты розных тыпаў на прапанаваную тэму; скласці план тэксту; размясціць пункты плана ў пэўнай паслядоўнасці; скласці пытанні да яго і іншыя заданні.

**Вынікі і іх абгрунтаванне.** Уключэнне вучняў у практычную дзейнасць арганізоўваецца пры дапамозе такіх метадаў і прыёмаў, як інфармацыйна-вучэбны дыялог, праспекцыя, кагнітыўная камунікацыя, трансфармацыя, прыём разгортвання тэматычнага сказа, абзаца і інш.

Праспекцыя – спосаб папярэджання інфармацыі ў працэсе вучэбнай камунікацыі, які рэалізуецца пры дапамозе ілюстрацый да лінгвістычных правіл, апорных схем, алгарытмаў,

Репозиторий ВГУ

пунктаў плана і інш. Гэты прыём спрыяе фарміраванню наступных камунікатыўна-інфармацыйных уменняў вучняў: разумець асноўную думку выказвання, вызначаць апорныя словы і словазлучэнні тэксту, перабудоўваць тэкст і выбіраць неабходную інфармацыю.

Інфармацыйна-вучэбны дыялог як форма калектыўнай працы арганізуецца ў межах вывучэння пэўнай лінгвістычнай тэмы. Вучням фармулюецца пэўная камунікатыўная задач, акрэсліваецца прадмет маўлення, вызначаецца тэма гутаркі. У час інфармацыйна-вучэбнага дыялогу вучні ствараюць выказванні на прапанаваную тэму, творча асэнсоўваюць яе, пры неабходнасці дабудоўваюць уласныя тэксты. Пры гэтым кожны выказвае свае думкі і меркаванні, карыстаецца апорнымі схемамі, словамі.

Прыём разгортвання тэматычнага сказа, абзаца тэксту таксама накіраваны на развіццё творчых уменняў вучняў. Тэматычны сказ абзаца – сказ, які ўтрымлівае слова, словазлучэнне ці частку сказа, якія патрабуюць развіцця, дэталізацыі. У тэксце выбіраецца адзін з названых элементаў. Вучні атрымліваюць заданне пашырыць тэматычны сказ абзаца, папоўніць яго, падабраўшы патрэбную інфармацыю, разгарнуць думку, абапіраючыся на ўласны вопыт, прывесці свае прыклады.

Метад кагнітыўнай камунікацыі прадугледжвае пошукавае заданне. Лінгвістычнае правіла вывучалася ў арганічнай сувязі з маўленчым матэрыялам, адбывалася дэманстрацыя граматычных з'яў і катэгорый праз выкарыстанне розных відаў маўленчай дзейнасці. Дзякуючы метаду кагнітыўнай камунікацыі, была створана магчымасць для пабудовы выказванняў з улікам сітуацыі маўлення ў вуснай або ў пісьмовай форме. Гэты метад спрыяе актывізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў, а таксама ўдасканаленню іх вучэбна-моўных уменняў: распазнавальных, класіфікацыйных, аналітычных.

У межах сацыяльна-ролевай гульні можна выкарыстоўваць такія метады і прыёмы, як "Складанне дыялогаў": вучням неабходна зарыентавацца ў сітуацыі, уявіць адрасата і абставіны, у якіх адбываецца суразмоўніцтва, праінсцэніраваць размову дзеючых асоб, выкарыстоўваючы прыдуманыя рэплікі-выказванні.

Стварэнне выказвання "Жывое слова" – гэта метад, на аснове якога адбываецца пабудова выказванняў пэўных жанраў (аб'ява, віншаванне, парада, спачуванне, прывітальнае і развітальнае слова, падзяка і інш.).

**Заключэнне.** Развіцце камунікатыўных навыкаў вучняў – гэта вельмі складаны і працяглы працэс. На ўроках беларускай мовы настаўнік павінен выкарыстоўваць такія метады і прыемы, якія дапамогуць малодшым школьнікам правільна выказваць свае думкі, актыўна ўдзельнічаць ў жыцці грамадства, авалодаць культурай інтэлектуальнай дзейнасці.

Спіс літаратуры

1. Ахманова, О.С. Словарь лингвистических терминов / О.С. Ахманова. – М.: КомКнига, 2007. – 576 с.
2. Ляшчынская, В.А. Тэкст на ўроках роднай мовы / В. А. Ляшчынская. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2008. – 64 с.

## ФОРМИРОВАНИЕ ИССЛЕДОВАТЕЛЬСКИХ УМЕНИЙ УЧАЩИХСЯ КОЛЛЕДЖА НА УРОКАХ ЛИТЕРАТУРЫ

*Е.А. Чикованова*
*Орша, Оршанский колледж ВГУ имени П.М. Машерова*

Исследовательская направленность педагогической дея-тельности – вопрос, которому уделяется значительное внимание при подготовке будущих учителей. Образовательные стандарты специальностей профиля «Педагогика» предусматривают, что специалист должен уметь работать с методической литературой и другими источниками педагогической информации, осуществлять самообразование, совершенствовать свои интеллектуальные и духовные способности, самостоятельно овладевать дополнительными знаниями в области профессиональной деятельности.

Анализ педагогической практики выявил противоречие между теоретической разработкой проблемы в науке и отсутствием в практике педагогических учебных заведений организованной системы развития исследовательских умений будущих учителей. Эта ситуация обусловила желание изучить проблему на основе осмысления методологических основ исследовательской деятельности и анализа педагогической практики.

Репозиторий ВГУ